**УДК 904 : 623.44 (476.5)"12/13"**

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ СВЕДЧАННІ ВАЙСКОВЫХ КАНФЛІКТАЎ І ВАЕННА-ТЭХНІЧНЫХ КАНТАКТАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ З КРЫЖАКАМІ Ў XIII–XIV стст.

***магістр гіст. навук У.А. ПЛАВІНСКІ***
**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск**

***канд. гіст. навук, дац. М.А. ПЛАВІНСКІ***
**Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск**

*Прысвечаны выяўленню і вызначэнню методыкі інтэрпрэтацыі археалагічных матэрыялаў, якія сведчаць аб вайсковых і ваенна-тэхнічных кантактах насельніцтва Беларускага Падзвіння з крыжакамі ў XIII–XIV стст., і іх суаднясенню з наяўнымі звесткамі пісьмовых крыніц. Высвятляецца, што нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці пісьмовых звестак аб вайсковых і ваенна-тэхнічных кантактах насельніцтва Беларускага Падзвіння з крыжакамі, археалагічныя сведчанні гэтых кантактаў пакуль застаюцца нешматлікімі. Фактычна, галоўнымі з іх з'яўляюцца арбалетныя балты, якія патрапілі ў культурныя напластаванні ўмацаваных паселішчаў і гарадоў Падзвіння ў выніку мілітарнай актыўнасці крыжакоў.*

Адной з асноўных мэт гістарычнай археалогіі можна лічыць суаднясенне вядомых паводле пісьмовых звестак гістарычных падзей з археалагічнымі рэаліямі. Уласна такім шляхам можна «ажывіць» матэрыялы, з якімі маюць справу археолагі (артэфакты, аб'екты, кантэксты) і пацвердзіць (а часам і абвергнуць) звесткі пісьмовых крыніц. Разам з тым, спробы такога суаднясення пісьмовых звестак і археалагічных крыніц звычайна сутыкаюцца з масай абмежаванняў, якія, у першую чаргу, прадвызначаны характарам археалагічных матэрыялаў. Натуральна, што такая праца павінна праводзіцца з максімальнай асцярожнасцю, каб пазбегнуць памылак і трывіяльных спекуляцыяў.

У сапраўдным паведамленні мы паспрабуем разгледзець ваенныя і ваенна-тэхнічныя кантакты насельніцтва Беларускага Падзвіння, жыхароў Полацкага княства і яго ўдзелаў, з крыжакамі. Падставай для спадзявання на перспектыўнае вырашэнне ўзнятага пытання з'яўляецца наяўнасць дастаткова падрабязных пісьмовых крыніц і, у першую чаргу, такога ўнікальнага помніка, як «Хроніка Лівоніі» Генрыха Латвійскага. Гэты аўтар, у адрозненне ад шмат якіх іншых храністаў і, тым больш, старажытнарускіх летапісцаў, вельмі падрабязна апісваў не толькі ход баявых дзеянняў, але і адрозненні ва ўзбраенні ўдзельнікаў гэтых вайсковых канфліктаў і, нават, асаблівасці іх выкарыстання ў баявых умовах. Наяўнасць такіх згадак дазваляе спадзявацца на магчымасць пошуку іх адлюстравання ў археалагічных матэрыялах.

Таму, найперш, варта звярнуцца да наяўных звестак, каб уявіць іх характар і крыніцазнаўчыя магчымасці. Ваенна-тэхнічныя кантакты ў выніку вайсковых канфліктаў апісваюцца Генрыхам дастаткова часта. Так, ён шматразова згадвае пра захоп крыжацкай зброі рускімі, літоўцамі, лівамі, эстамі (1208, 1211, 1212, 1223, 1224 гг.) [5, с. 103, 126, 144, 146, 220, 224]. Але і крыжакі таксама захоплівалі зброю рускіх ці літоўцаў у якасці здабычы (1205, 1218, 1224 гг.) [5, с. 79, 180, 228].

Таксама Генрых паведамляе аб тым, што зброя з'яўляецца падарункам падчас дыпламатычных місій: *«В начале восьмого года господин епископ, желая снискать дружбу и расположение Владимира, короля полоцкого, какие тот проявлял к его предшественнику, епископу Мейнарду, послал ему через аббата Теодориха боевого коня с вооружением, но по дороге литовцы-разбойники ограбили аббата»* (1206 г.) [5, с. 82].

Што ж тычыцца археалагічных даных, дык іх можна падзяліць на дзве катэгорыі: 1) асобныя прадметы ўзбраення, выяўленыя ў культурных слаях пасяленчых помнікаў і выпадковыя знаходкі; 2) сляды ваенных канфліктаў, у першую чаргу, сляды катастрафічных падзей (сляды штурмаў і спаленняў умацаваных і неўмацаваных паселішчаў).

Звяртаючыся да першай катэгорыі археалагічных даных, варта каротка спыніцца на агульнай характарыстыцы стану развіцця ваеннай тэхнікі абодвух бакоў – крыжакоў і жыхароў Полацкага княства. На пачатку разглядаемага перыяду – ў канцы XII – пачатку XIII ст. – комплексы зброі бліжняга бою і засцерагальнага ўзбраення варагуючых бакоў адрозніваліся слаба. Так, засцерагальнае ўзбраенне як крыжакоў, так і палачан складалася з кальчуг, шчытоў (міндалепадобнай альбо блізкай да трохвугольнай формаў), шлемаў, найчасцей, стажковых (мал. 1). Наборы сродкаў зброі бліжняга бою таксама не выяўляюць



Library of Polotsk SU

прынцыповых адрозненняў. Зрэшты, пэўная спецыфіка, натуральна, існавала, але яна выяўлялася хутчэй у сферы асартыменту асобных тыпаў узбраення, што можна заўважыць па даных усё той жа «Хроніка Лівоніі»: *«Ливы бежали стремглав, боясь, что войско гонится за ними, так как видели тевтонский рыцарский шлем, который [на самом деле] надел себе на голову один лив, убив тевтона»* [5, с. 65].




Мал. 1. Выявы крыжацкіх (1–2) і полацкіх ваяроў (3–6) XII–XIII стст.:
1 – надмагільны камень з царквы Святога Марціна на выспе Гольм (Марцінсала) у нізоўях Заходняй Дзвіны (Латвія), 2 – надмагільны камень з царквы Каруз у Ляанэмаа (Эстонія), 4–6 – графіці з гарадзішча Маскавічы (1– пав. Э. Мугурэвічса [16, 16:1 att.], 2 – пав. К. Кройц [15, p. 128, fig. 10:11], 3–6 – пав. Л.У. Дучыц)

Прыкладна з першай паловы і, асабліва, з сярэдзіны – трэцяй чвэрці XIII ст. у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе пазначаецца і набірае абароты працэс узмацнення і павелічэння вагі засцерагальнага ўзбраення, што выявілася ў з'яўленні і распаўсюджанні крытых пласцінавых даспехаў, сродкаў аховы рук і ног (наплечнікі, наручы, понажы і г.д.), розных форм закрытых шлемаў і г.д. Адказам на ўзмацненне засцерагальнага ўзбраення стала развіццё больш дасканалых пранікаючых сродкаў бліжняга бою, у першую чаргу, колючых мячоў [7, с. 16]. У сваю чаргу, на землях заходняй Русі і на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, якая на працягу акрэсленага перыяду знаходзілася ў стане пастаяннага пашырэння на ўсход і поўдзень, аналагічныя працэсы таксама мелі месца, аднак праходзілі значна менш актыўна [11, с. 21, 68, 75, 105, 120]. Наколькі можна меркаваць, асноўным накірункам у эвалюцыі засцерагальнага ўзбраення і зброі бліжняга бою насельніцтва Беларускага Падзвіння заставалася



libraryofpolotsk.su

захаванне і далейшае развіццё старажытнарускіх традыцый, а менавіта, выкарыстанне ў якасці асноўных сродкаў аховы корпуса кальчуг, ламелярных і лускавых даспехаў, адкрытых стажковых і сфераканічных шлемаў для аховы галавы і г.д.

Увогуле, сучасны стан нашых ведаў аб ваеннай тэхніцы заходнерускіх зямель дазваляе думаць, што тут быў ва ўжытку адносна лёгкі комплекс узбраення, адрозны ад класічнага заходне- і цэнтральнаеўрапейскага «рыцарскага» набору зброі і засцерагальных сродкаў. Аналагічны аблегчаны комплекс узбраення быў уласцівы для шэрагу ўскраінных рэгіёнаў Еўропы, так бы мовіць, еўрапейскага *«frontier»*а, такіх як Перэнейская і Апенінская паўвыспы, Шатландыя і г.д.

У наяўных археалагічных даных першая, з вызначаных намі, катэгорыя матэрыяльных сведчанняў ваенна-тэхнічных кантактаў (асобныя прадметы ўзбраення, выяўленыя ў культурных слаях пасяленчых помнікаў і выпадковыя знаходкі) вылучаецца з вялікімі складанасцямі. На сённяшні дзень узоры дрэўкавай і абуховай зброі крыжацкага паходжання на тэрыторыі Беларускага Падзвіння практычна не вылучаюцца.

Амаль такая ж сітуацыя і з клінковай зброяй. Усе наяўныя ў нашым распараджэнні ўзоры мячоў XIII–XIV стст. маюць клінкі заходне- ці цэнтральнаеўрапейскага паходжання. Увогуле, сведчанняў мясцовай вытворчасці клінковай зброі ў Беларускім Падзвінні, як і на заходніх землях Русі ўвогуле, пакуль не зафіксавана. Пры гэтым, значная частка клінкоў XIII ст. была аснашчаная рукаяцямі тыпаў І і ІІ паводле А.М. Кірпічнікава, якія маюць паўднёва-ўсходнепрыбалтыйскае паходжанне [9, с. 19–23, 33]. Прычым мячы гэтых тыпаў маглі выкарыстоўвацца ў рэгіёне яшчэ і ў XIV ст. [10]. Адначасова з імі выкарыстоўваліся мячы агульнаеўрапейскіх раманскіх тыпаў [9, с. 32–33].

Можна меркаваць, што на працягу XIV і ў XV ст. у Падзвінні ідзе працэс распаўсюджання колючых мячоў, прызначаных для прабівання «рыцарскіх» даспехаў. Гэтую тэндэнцыю адлюстроўваюць мячы сярэдзіны XIII – сярэдзіны XIV ст. з «Паўночнай Беларусі» [9, с. 25–26, мал. 24] і меч другой паловы XV ст. з ракі Дрыса (тып XVa пав. Р.Э. Окшота) [1, с. 25, 27]. На жаль, гэтыя ўзоры клінковай зброі з’яўляюцца выпадковымі знаходкамі, а таму не могуць быць звязанымі з пэўным археалагічным кантэкстам і, адпаведна, пэўнай падзеяй ці ваенна-тэхнічнай традыцыяй.

Інакш выглядае сітуацыя са зброяй далёкага бою. Асноўнай катэгорыяй знаходак, якія сведчыць аб кантактах насельніцтва Падзвіння з крыжакамі, могуць быць арбалетныя наканечнікі стрэл – балты. За гады даследаванняў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння знойдзена каля 70 арбалетных балтоў другой паловы XIII–XIV ст. Арбалетныя стрэлы падзяляюцца на ўтулкавыя і чарашковыя, сярод знаходак у рэгіёне вылучаюцца 3 тыпы ўтулкавых і 4 тыпы чарашковых балтоў.

**Тып 1 (1*)** – утулкавыя пірамідальныя балты квадратнага сячэння з шыйкай (тыпы прыводзяцца паводле А.Ф. Мядзведзева [6, с. 94–97] і Г. Рацкевічуса (*) [17, p. 62–118]). У вялікай колькасці падобныя наканечнікі знойдзены на помніках, жыхары якіх сутыкнуліся з дзейнасцю крыжакоў [17, p. 68]. На тэрыторыі Падзвіння адзін наканечнік знойдзены ў раскопах гарадзішча Пруднікі (мал. 2: 1). Аналогіі з тэрыторыі Беларусі Паходзяць з Верхняга Панямоння – Навагрудка і гарадзішча Турэйск [8, с. 210].




Мал. 2. Утулкавыя арбалетныя балты з тэрыторыі Беларускага Падзвіння:
1 – тып 1 (1*), 2–3 – тып 8 (7*), 4 – тып 9; 1–2 – Пруднікі, гарадзішча,
3 – Полацк, Верхні замак [13, рис. 30:4], 4 – Полацк, гарадзішча [3, рис. 7:2]

**Тып 8 (7*)** – лаўралістыя балты рамбічнага сячэння (мал. 2: 2–3). Вылучаюцца два варыянты: ранні (XII–XIII стст.) і позні (XIV–XV стст.). Пазнейшыя наканечнікі адрозніваюцца тым, што найбольшае пашырэнне баявой галоўкі ў іх знаходзіцца не ў сярэдзіне, а бліжэй да вастрыя. Аналогіі ў вялікай колькасці прасочваюцца на помніках паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі і Польшчы, звязаных з вайсковай актыўнасцю крыжакоў [17, p. 283]. Гэты тып з’яўляецца адным з найбольш распаўсюджаных

на тэрыторыі Беларусі. На Падзівнні адзін болт варыянту 1 знойдзены на гарадзішчы Пруднікі. Па адным наканечніку другога варыянту паходзіць з Ніжняга замку Віцебска, Верхняга замку Полацка, Друцка [13, рис. 30:4]. Аналогіі на тэрыторыі Беларусі паходзяць, пераважна, з Панямоння [8, с. 210].

**Тып 9** – канічныя балты круглага сячэння. Адзін болт тыпу 9 знойдзены на Першапачатковым полацкім гарадзішчы падчас раскопак Дз.У. Дука на гарадзішчы (мал. 2: 4). Акрамя арбалетнага балта, у раскопе 2007 г. на Гарадзішчы знойдзены шэраг наканечнікаў стрэл, гатовыя і незавершаныя апрацоўкай пласціны ламелярнага даспеха і кальчужныя колцы, прылады кавальскай працы. Стратыграфія раскопу 2007 г. на Гарадзішчы не дазваляе вызначыць вузкае датаванне дадзенай знаходкі [3, с. 49].

Чарашковыя балты падыходзілі да ўсіх тыпаў арбалетаў, як да самых простых аднасастаўных, так і да стальных з краненкінам альбо зубчастай рэйкай. У залежнасці ад тыпа арбалета змянялася толькі вага і прапорцыі балта. Да чарашковых арбалетных балтоў належаць наступныя тыпы

**Тып 14 (15*)** – балты квадратнага сячэння з ромбападобнай гранню (мал. 3). Гэта самы распаўсюджаны тып балтоў, які мае даволі шырокія храналагічныя межы выкарыстання. А.Ф. Мядзведзеў датаваў яго канцом XII – пачаткам XV ст. [6, с. 95]. Г. Рацкевічус вылучае два варыянты гэтага тыпа, якія адрозніваюцца масіўнасцю, прапорцыямі і добра выяўленымі гранямі баявой галоўкі. Аналогіі дадзенаму тыпу маюць шырокія геаграфічныя і храналагічныя межы. У вялікай колькасці яны былі на ўзбраенні крыжакоў. Шмат падобных балтоў паходзіць з раскопак гарадзішчаў і замкаў Літвы, дзе яны датуюцца XIII – першай паловай XVI ст. [17, p. 95–110]. Таксама тып 14 з'яўляецца самым распаўсюджаным на тэрыторыі Беларусі. Шмат наканечнікаў тыпу 14 знойдзена на Падзвінні. Прадстаўнічая калекцыя такіх балтоў паходзіць з археалагічнага комплексу Пруднікі – адразу дзевяць адзінак. Усе экзэмпляры, знойдзеныя на гарадзішчы, былі выяўленыя ў слаях з канструкцыямі вала. Адзін наканечнік паходзіць з гарадзішча Маскавічы, яшчэ адзін знойдзены на гарадзішчы Замкавая гара ў Браславе, два арбалетныя балты тыпу 14 выяўлены М.В. Клімавым на Заполоцкім пасадзе Полацка [4, мал 2:5, 6]. Два экзэмпляры паходзяць з Лукомля [14, рис. 17.4], адзін з Друцку. Акрамя таго, на тэрыторыі Беларусі такія балты, таксама ў значнай колькасці, сустракаюцца на Панямонні і ў матэрыялах з раскопак Брэста [8, с. 211].

**Тып 15 (14*)** – балты квадратнага сячэння з ромбападобнай гранню і зрэзанымі вугламі (мал. 4: 1–4). Тэрыторыя распаўсюджання дадзенага тыпу і яго храналогія такія ж, як і ў тыпа 14. Васямнаццаць балтоў тыпу 15 паходзяць з раскопак археалагічнага комплексу Пруднікі. Адзін экзэмпляр паходзіць з напластаванняў XIV ст. Верхняга замка Полацка, адзін – з Ніжняга замка Віцебска. Знаходка з гарадзішча Лукомль адносіцца, верагодна, да падзеяў 1386 г., калі гарадзішча было захопленае князем Андрэем Альгердавічам з атрадам крыжакоў. Адзін наканечнік знойдзены на тэрыторыі Друцкага дзядзінца ў напластаваннях XIII–XIV стст. [8, с. 211].



Мал. 3. Араблетныя балты тыпу 14 (15*) з Беларускага Падзвіння: 1 – Маскавічы, гарадзішча (мал. М.А. Плавінскага), 2–3 – Полацк, Запалоцкі пасад [4, мал 2:5–6], 4-8 – Пруднікі, гарадзішча [8, рис. 2:6-9, 11]



Мал. 4. Араблетныя балты тыпаў 15–16* з тэрыторыі Беларускага Падзвіння: 1 - 4 – тып 15 (14*), 5–6 – тып 16 (18*), 7 - 9 – тып 16*: 1 - 4, 7 - 9 – гарадзішча і селішча Пруднікі [8, рис. 3:9 - 12, рис. 4:8–9, 11], 5–6 – Маскавічы, гарадзішча [8, рис. 4:1–2]

**Тып 16 (18*)** – балты рамбічнага сячэння з ромбападобнай гранню і зрэзанымі вугламі (мал. 4: 5–6). Тып адрозніваецца ад папярэдняга сячэннем. Тэрыторыя распаўсюджання знаходак дадзенага тыпу і яго храналогія аналагічныя тыпам 14 і 15. Сем экзэмпляраў тыпу 16 знойдзены на Падзвінні. Тры наканечнікі паходзяць з напластаванняў археалагічнага комплексу Пруднікі, два – з раскопак на Маскавіцкім гарадзішчы, адзін з гарадзішча ў Лукомлі [8, с. 211].

**Тып 16*** – біпірамідальныя балты квадратнага сячэння з круглай шыйкай (мал. 4: 7–9). У тыпалогіі А.Ф. Мядзведзева падобныя экзэмпляры адлюстравання не знайшлі. Балты тыпу 16* супадаюць з тыпамі 14–16 паводле храналогіі, тэрыторыі распаўсюджання і аналогіяў. Яны сустракаюцца на тэрыторыі Літвы, Латвіі, Польшчы, на помніках, жыхары якіх так ці інакш сутыкаліся з мілітарнай актыўнасцю крыжакоў. На тэрыторыі Беларускага Падзвіння знойдзена дзесяць балтоў тыпу 16*. Пяць – на тэрыторыі археалагічнага комплексу Пруднікі, адзін – на Замкавай гары ў Браславе, па адным на Лукомльскім гарадзішчы і на Друцкім дзядзінцы [8, с. 210].

Разглядаючы тапаграфію знаходак (мал. 5), выяўляецца карціна, якая пацвярджае меркаванне аб пранікненні арбалета на тэрыторыю Беларускага Падзвіння з захаду, ад крыжакоў. Абсалютная большасць, а менавіта, 46 наяўных балтоў паходзяць з захаду Беларускага Падзвіння – рэгіёна Браслаўскага Паазер’я – тэрыторыі, якая на працягу некалькіх стагоддзяў з’яўлялася заходнім памежжам Полацкага княства. Найбольшая калекцыя знаходак арбалетных балтоў паходзіць з археалагічнага комплексу Пруднікі. Гарадзішча і селішча Пруднікі знаходзяцца на беларуска-латвійскім памежжы на левым беразе ракі Вята, за 1,5 км ад яе ўпадзення ў Заходнюю Дзвіну. Усе тыпы балтоў, рэпрэзентаваныя ў напластаваннях гарадзішча Пруднікі ў колькасці 41 экзэмпляра, варта лічыць, па большасці, крыжацкімі. З 41 балта, толькі 5 знойдзеныя на селішчы, а астатнія – на гарадзішчы. З экзэмпляраў з гарадзішча, месца знаходкі якіх дакладна зафіксаванае, 28 паходзяць з раскопак вала, дзе былі выяўленыя сляды спалення. Большасць з балтоў дэфармаваная ў выніку баявога выкарыстання [8, с. 212 - 216].

Абапіраючыся на шэраг фактараў, у тым ліку марфалагічныя асаблівасць калекцыі, можна меркаваць, што жыхары гарадзішча пацярпелі ад нападу з боку атраду, у складзе якога былі крыжакі, верагодна, у сярэдзіне – другой палове XIII ст. У кантэксце гэтых падзей варта прывесці згадку Мацеем Стрыйкоўскім пра сутычку войскаў Міндоўга з палачанамі і немцамі, недалёка ад Браслава (1244 г.):




Мал. 5. Знаходкі арбалетных балтоў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння:
1 –Браслаў, 2 – Маскавічы, 3 – Пруднікі, 4 – Полацк,5 – Віцебск, 6 – Лукомль, 7 – Друцк

*Параненыя енчуць, коні іржуць, грукат зброі на кожным кроку*
*Стрэлы са свістам, як дождж, з лукаў крывых вылятаюць*
*Адны з арбалетаў цэляць, а тыя з прашчы камяні выпускаюць…* [18, s. 196].

Больш ні на адным з помнікаў Браслаўскага Паазер’я не знойдзена значнай колькасці арбалетных балтоў. Тры наканечнікі паходзяць з гарадзішча Маскавічы (тыпы 14 і 16). Згодна з агульнапрынятай

храналогіяй гарадзішча, жыццё на ім спыняецца ў канцы XIII ст. Два наканечнікі (тыпы 14 і 16*) знойдзеныя на гарадзішчы Замкавая гара ў Браславе [8, с. 215].

Актывізацыя выправаў крыжакоў у глыб Полацкай зямлі прыпадае на канец XIII – пачатак XIV ст. Маюцца звесткі, што невядомы літоўскі князь, які княжыў у Полацку ў трэцяй чвэрці XIII ст., быў ахрышчаны і, не маючы спадчыннікаў, адпісаў княства Рыжскай царкве. Пасля яго смерці, Полацк перайшоў да Ордэна. Аднак, з-за злоўжыванняў рыцараў, мясцовыя жыхары звярнуліся па дапамогу да князя Віценя, які ў 1307 г. выгнаў з горада крыжакоў [2, с. 30]. Рэгулёвымі паходы крыжакоў у глыб Полаччыны робяцца пасля ўключэння яе ў склад ВКЛ. Пісьмовыя крыніцы зафіксавалі рэйды інфлянцкіх рыцараў пад 1323, 1333, 1334 гг. [12, с. 147].

Характэрна, што наяўныя арбалетныя балты, за выключэннем знаходак з Браслаўскага Паазер'я, прадстаўленыя адзінкавымі знаходкамі з напластаванняў буйных цэнтраў рэгіёна – Полацка, Віцебска, Друцка, Лукомля. Відавочна, што пранікненне арбалета на тэрыторыю Полацкай зямлі з захаду, ад нямецкіх рыцараў. Акрамя Падзвіння, больш-менш прадстаўнічыя калекцыі арбалетных наканечнікаў паходзяць з тэрыторыі Верхняга Панямоння, прычым з помнікаў, жыхары якіх таксама сутыкаліся з агрэсіяй крыжакоў, што вядома па пісьмовых крыніцах. А самі арбалетныя балты з'яўляюцца бадай што адзінай катэгорыяй знаходак у матэрыяльная культуры Беларускага Падзвіння і ўсёй тэрыторыі Беларусі, якая адлюстроўвае кантакты насельніцтва з крыжакамі.

Дапусціўшы магчымасць адзінкавых выпадкаў пранікнення арбалетаў на захад Беларускага Падзвіння з першых эпізодаў кантактаў з крыжакамі, з пачатку XIII ст., можна канстатаваць, што шырокага распаўсюду ў гэты перыяд дадзеная зброя не атрымала. Як кантэкст выяўлення, так і марфалогія балтоў, сведчаць, што арбалет пачаў пранікаць у рэгіён у выніку кантактаў з ордэнцамі, якія сталі больш частымі з другой паловы XIII ст., і распаўсюдзіўся на тэрыторыі Полацкай зямлі ў перыяд паміж сярэдзінай XIII – сярэдзінай XIV ст., менавіта так могуць датавацца ўсе наяўныя балты з рэгіёна. Малая колькасць арбалетных стрэл на тэрыторыі Полацкай зямлі, у комплексе з вялікай колькасцю стрэл лука самых разнастайных тыпаў, тлумачыцца, верагодна, тым, што шырокага распаўсюджання арбалет тут не атрымаў. Верагодней за ўсё, пасля заканчэння актыўных канфліктаў з крыжакамі, жыхары рэгіёну ўвогуле рэдка сутыкаліся з арбалетным узбраеннем. Знаходак, якія б адносіліся да XV ст. мы фактычна не маем, а адзінкавыя пісьмовыя згадкі сведчаць аб сімвалічным статусе арбалета ў арсеналах гарадоў і замкаў.

Такім чынам, прыведзеныя факты сведчаць, што, нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці пісьмовых звестак аб вайсковых і ваенна-тэхнічных кантактах насельніцтва Беларускага Падзвіння з крыжакамі, археалагічныя сведчанні гэтых кантактаў пакуль застаюцца нешматлікімі. Фактычна, галоўнымі з іх з'яўляюцца арбалетныя балты, якія патрапілі ў культурныя напластаванні ўмацаваных паселішчаў і гарадоў Падзвіння ў выніку мілітарнай актыўнасці крыжакоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Бохан, Ю.М. Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI стагоддзях / Ю.М. Бохан. – Мінск, 2012. – 151 с.: іл.

2. Варонін, В.А. Падзеі 1307 года ў Полацку: спроба крытычнага разбору / В.А. Варонін // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (24–25 кастрычніка 2007 г.) / Полац. дзярж. ун-т. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 30–40.

3. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2011. – Вып. 21. – С. 30-60.

4. Клімаў М.В. Новыя звесткі аб раскопках запалоцкага пасада г. Полацка (па выніках раскопак 2008 г.) / М.В. Клімаў. // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А.Р. Брадоўскага, 22–23 кастр. 2009 г., Віцебск / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 39–48.

5. Латвийский, Генрих. Хроника Ливонии / Генрих Латвийский. – Введение, перевод и комментарии С.А. Аннинского. – М. – Л., 1938. – 351 с.

6. Медведев, А.Ф. Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. / А.Ф. Медведев // Свод археологических источников. – Вып. Е1–36. – М., 1966. – 184 с., ил.

7. Окшотт, Р.Э. Меч в век рыцарства. Классификация, типология, описание / Р.Э. Окшотт. – М., 2007. – 176 с.

8. Плавинский, В.А. О времении появления арбалета на западе Белорусского Подвинья / В.А. Плавинский // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар им. академика В.В. Седова : материалы 57-го заседания. – М. – Псков, 2011. – С. 210–224.

9. Плавінскі, М.А. Нарысы гісторыі клінковай зброі X–XIII стагоддзяў на Беларусі / М.А. Плавінскі. – Мінск, 2009. – 158 с.: іл.



Library of Polotsk SU

10. Плавинский, Н.А. О хронологии мечей балтийских типов и их аксессуаров на Руси // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар им. академика В.В. Седова : материалы 57-го заседания. – М. – Псков, 2011. – С. 205–209.

11. Плавинский, Н.А. Очерки истории вооружения белорусских земель X–XIII веков / Н.А. Плавинский. – Київ, 2014. – 144 с.: ил.

12. Сагановіч, Г.М. Полацк і Нямецкі ордэн: ад вайны да васалітэта і саюза / Г.М. Сагановіч. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (24–25 кастрычніка 2007 г.) / Полац. дзярж. ун-т. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 144–151.

13. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Мінск, 1975. – 136 с., ил.

14. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Мінск, 1978. – 160 с., ил.

15. Creutz, K. Tension and Tradition. A A Study of Late Iron Age Spearheads Around the Baltic Sea / K. Creutz. – Stockholm, 2003. – 520 p.

16. Mugurēvičs, Ē. Viduslaiku ciems und pils Salaspils novadā / E. Mugurēvičs. – Rīga, 2008. – 264 lpp.

17. Rackevičius, G. Arbaletas ir lankas Lietuvoe XIII–XVI a. / G. Rackevičius. – Vilnius, 2002. – 296 p., iliustr.

18. Stryjkowski, M. O poczatkach, wywodah, dzielnosciach, Sprawach rycerskich i domowych slawnego narody litewskiego, zemojdzkiego i ruskiego / M. Stryjkowsi. – Warszawa, 1978.

**УДК 902:727.3.05-033.5**

## СТЕКЛО И ГУТА ПОЛОЦКОГО ИЕЗУИТСКОГО КОЛЛЕГИУМА КОНЦА XVI – НАЧАЛА XIX вв.

***магистр ист. наук А.А. СОЛОВЬЁВ***
**Полоцкий историко-культурный музей-заповедник, Полоцк**

*Исследуется один из аспектов материальной культуры и производственной деятельности полоцких иезуитов – стеклянные изделия и стеклоделие. Рассмотренный ассортимент найденной на территории коллегиума продукции, остатки стекольной гуты позволили проследить технологичекие особенности изготовления некоторых изделий на различных этапах их производства. На основе сопровождающих остатки гуты находок изразцов и фаянса был очерчен период существования данного производства на территории коллегиума. В ходе изучения найденных изделий проведена попытка выделения среди собранной в коллегиуме коллекции предметов, изготовленных в гуте, импортных изделий и продукции полоцких иезуитов.*

С возрождением Полоцка после Ливонской войны тесно связано возобновление стеклоделия, традиции которого были утрачены в XIII в. – времени значительного ослабления Полоцка из-за постоянных войн и усобиц, нарушения давних культурных связей с восточно-славянским княжествами и Византией. Приток новых жителей, усиление влияния католической церкви благодаря заселению в городе иезуитов и монахов других католических орденов привели к активизации связей с Западной Европой (в основном через Польшу). Параллельно долгое время сохраняли позиции протестантские общины, ориенированные на Швецию (лютеране) и Голландию (кальвинисты). Влияние последних было ощутимо еще в первой половине XVII в. Таким образом, под влиянием европейских традиций происходят значительные изменения как в укладе жизни полочан, так и в ремесленном производстве – его организации, технологии, ассортименте изделий и росте количества специальностей, среди которых было и стеклоделие. Фактически к началу XVII в. Полоцк компенсировал большую часть потерь, нанесенных ему Ливонской войной. Это предопределило его новое возрождение, продолжавшееся до Русско-польской войны 1654 – 1656 гг. Очередное восстановление Полоцка началось только с середины XVIII в. и продолжалось до войны 1812 г. и шляхетского восстания 1830 – 1831 гг.

Возрождение стеклоделия было тесно связано с производством глазурованной керамики. Состав, рецепт и технология призводства глазури и стекла практически аналогичны, и это обеспечивало сходство работы гончаров и стеклоделов. Но была и своя специфика. Благодаря широкому распространению залежей гончарной глины гончары имели возможность селиться непосредственно в городах, преимущественно на окраинах. В Полоцке это были Заполотье, Экимань. Отдельные мастерские, специализировавшиеся на небольших обьемах производства, могли быть даже на территории Великого посада за городской стеной (например, плитницы или цагельни). Стеклоделам было сложнее – сырье для варки и производства стекла призводилось в лесу. Он же был и источником топлива. Поэтому гуты (стекольные мастерские) ремесленники предпочитали располагать прямо в лесах или вблизи от них. Сказывалось и то,



library.polotsk.by